# Галава

Канстанцін Сцешык

*Палкін увайшоў і паставіў торбу на стол. Торбу вялікую, з падробленай скуры, быццам спартыўную, нібыта зялёную, нібыта сінюю, але хутчэй карычневую. Паставіў пасярэдзіне стала, перакуліўшы паўпустую бутэльку. Я ледзь паспеў прыбраць талерку з куском селядца, аб'едзенымі селядцовымі хрыбтамі і лужынай ліпучага масла, у якім звычайна прадаецца селядзец, калі не набываць яго на вагу.*

**Я**. Палкін!

*Палкін прамаўчаў і вылупіўся на мяне так, быццам толькі што прачнуўся і нешта такое пра сябе зразумеў.*

**Я.** Ну што ты як парсюк? Адсунуўся хаця бы.

*Я вызваліў месца на стале, прыбраўшы лішняе, літаральна ўсё. Мы з Пухавым, чакаючы Палкіна і так і не дачакаўшыся, усё з'елі і выпілі, пакінуўшы чуць, толькі што сабаку, дарослага чалавека не накорміш.*

**Я**. Мы чакалі, чакалі. Пухаў, бачыш, ужо дадому падаўся.

**Палкін.** Ды пайшоў ён, гэты Пухаў.

**Я.** Саш, ну ты чаго?

*Палкін паглядзеў на мяне па-змоўніцку.*

**Палкін.** Ведаеш, я надта не люблю, калі гавораць: «тут такое!»... Але тут, рэальна, такое!

**Я.** Якое?

**Палкін.** У торбе.

**Я.** Што там?

**Палкін.** Я баюся табе паказваць. Як бы ты на сцяну не палез.

**Я.** Сцяна надта вертыкальная. Саш, я саслізну.

**Палкін.** А можа і не саслізнеш. Тут такое!

*Палкін апошнія словы амаль што крычаў, а пасля перайшоў на шэпат.*

**Палкін.** Тут такое... Я думаў, што ў мяне таго. Аднак, і да гэтага думаю.

*Ён паглядзеў на мяне пакутніцкі і нават праслязіўся.*

**Палкін.** Косця. Можа мне ў дурку?

**Я.** Ды я адкуль ведаю?

**Палкін.** Ты, гэта, напагатове трымай што-небудзь.

**Я.** Ды што хоць?

**Палкін.** Тэлефон. Ну ці біту.

**Я.** Якую біту? Я што, па-твойму, у бейсбол гулец. У хакей толькі што малым ганяў.

**Палкін.** Клюшка ёсць?

**Я**. На балконе...здаецца. Паламаная.

**Палкін.** Цягні.

*Я схадзіў на балкон за клюшкай.*

**Я.** Ну, у яе крук адламаўся, лічы, што толькі палка засталася.

**Палкін.** Фіг з ім, з кручком. Галоўнае, што дубіна ёсць.

**Я.** Гэта называецца чаранок.

**Палкін.** Пляваць.

*Палкін памуліўшы, пашамкаў вуснамі, паглядзеў на торбу на стале.*

**Палкін.** Ты, галоўнае, калі што раптам ня так, адразу мяне гэтым чаранком гасі, а пасля ў дурку звані. Тэлефон пад рукамі?

*Я дастаў з кішэні смартфон.*

**Я.** А як званіць-та туды? Я не званіў ні разу. Не было патрэбы.

**Палкін.** Шча.

*Ён пачухаў патыліцу.*

**Палкін.** Эт самае. Звані тупа 103.

**Я.** Лады.

*Палкін набраў ў грудзі паветра, патрымаў трохі і з шумам выдыхнуў.*

**Палкін.** Вазьмі дубіну зручней, а то занадта млява трымаеш.

**Я.** Гэта чаранок.

**Палкін.** Добра, чаранок, мамчын ты хакеіст.

*Я перахапіў тое, што асталося ад клюшкі, зручней і стаў так, быццам збірайся па-самурайскі сячы галаву Палкіну.*

**Палкін.** Гатовы?

**Я.** Гатовы.

*Палкін кораценька выдыхнуў.*

**Палкін.** Тады паехалі.

*Ён нахіліўся над торбай, ужыгнуў маланкай, засунуў у торбу рукі і асцярожна выняў адтуль нешта, што я напачатку палічыў галоўкай капусты зарослай чорнымі валасамі. І ўрачыста працягнуў мне.*

*З маіх рук вывалілася клюшка. У далонях Палкіна ўтульна ляжала чалавечая галава і і глядзела на мяне, зрэдку сонна міргаючы.*

*Я паказаў пальцам, разявіўшы рот выціснуў нейкі гук, прыкрыў рот. Галава ўсміхнулася рогам рота.*

**Палкін.** Ты бачыш тое ж, што і я?

**Я**. Што гэта?

**Палкін.** Ты мне адкажы: ты бачыш тое ж што і я?

**Я.** Ну...мабыць.

**Палкін.** Што ты бачыш?

**Я.** Галаву.

**Палкін.** Мёртвую?

**Я**. Здаецца не. Яна міргае. І усміхаецца.

*Я паглядзеў на Палкіна. Той стаяў, працягваючы мне валасатую галоўку капусты з тварам і па-дурному усміхаўся.*

**Я**. Паслухай. Гэта, канешне, смешны жарт. І я, нават, амаль клюнуў.

**Палкін.** У сэнсе?

**Я.** Гэта цацка.

*Усмешка спаўзла з твару Палкіна.*

**Палкін.** Ты ідыёт?

**Я.** Я ж бачу, што гэта нейкая дарагая фігня з крамы прыколаў.

**Палкін.** Косця, адкажы мне, ты – ідыёт?

**Я.** Саша! Гэта штука для розыгрышу! Ты што?

**Палкін.** А, ты гэтак, так? Ну добра!

**Я.** Што добра! Яна нават не вельмі акуратна зроблена, вось паглядзі!

*Я тыркнуў галаве, якая ляжала на далонях Палкіна, у твар, пад левае вока. Галава паморшчылася, з вока выкацілася сляза. Скура пад вокам была цёплай і цалкам звычайна чалавечай навобмацак.*

**Палкін.** Ты шо робіш? А калі табе так тыркнуць? Балюча ж!

**Я.** Ды ну. Японская нейкая прыблуда... скура з разагрэтага сілікону... І слёзы... яны...

*Я запнуўся, паклаўшы накрыж рукі на грудзі.*

**Я.** Звычайная цацка.

**Палкін.** Упэўнены?

*Я кіўнуў.*

*Палкін моўчкі паглядзеў на мяне, як маці на сына, які згубіў па дарозе са школы зменку – і ўжо не ўпершыню.*

**Палкін.** Люблю цябе, сябра, але ты часам бываеш...

*Палкін горка запнуўся.*

**Я.** Ну, якім? Тупым?

**Палкін.** Я хацеў сказаць што-небудзь больш абразліва, але не ідзе ў галаву.

**Я.** Добра. Няхай я буду проста тупым.

*Мы пастаялі трохі, разглядаючы галаву ў руках Палкіна.*

**Я.** Ды што ты трымаеш яе, быццам бохан нейкі? Давай яе пакладзем хаця бы куды-небудзь.

*Палкін кіўнуў. Я прыбраў са стала ўсё залішняе, знайшоў у ваннай чысты, пухнаты ручнік і заслаў стол. Палкін клапатліва паклаў галаву на ручнік.*

*Хвіліну мы стаялі, сагнуўшыся, і глядзелі ў вочы галаве. Галава ледзь усміхалася і час ад часу нам падміргвала.*

*У мяне стала колам спіна.*

**Я.** Слухай, што мы як дзеці. Давай хаця бы на крэслы сядзем.

**Палкін.** Давай.

*Мы селі не адрываючы вачэй ад галавы.*

**Я.** Можа, Пухава паклічам?

**Палкін.** Табе нас дваіх мала?

*Я паціснуў плячыма.*

**Я.** Сябра. Яшчэ з дзіцячага садку.

**Палкін.** Гэта што, крытэрый?

**Я.** Ну...

**Палкін.** Пайшоў ён. Гэты Пухаў. Наогул не разумею, што ты з ім дагэтуль цягаешся?

**Я.** Ну а што я яму скажу? «Ты мне больш не сябра, Пухаў»

**Палкін.** Во! Так і трэба сказаць.

**Я.** Ты яго дрэнна ведаеш. Шчыра кажучы, ён чалавек ня кепскі.

**Палкін.** Засранец!

**Я.** Гэта ты так лічыш. Я-та яго лепей ведаю.

*Галава заўсміхалася, зажмурыўшыся.*

**Палкін.** Во, глядзі, нават яно рагоча над тваёй ідэяй Пухава паклікаць.

**Я.** Яно, можа, проста так смяецца. Мы ж не ведаем, што тамака ў яго...ну, унутры.

**Палкін.** А прыйдзе твой Пухаў і, зуб аддам, палезе нажом калупаць.

**Я.** Ды адчапіся ты ўжо ад Пухова! Не буду яго зваць.

**Палкін.** Во і правільна.

*Мы змоўклі, гледзячы ў задаволены твар на п'едэстале з ручнікоў.*

**Палкін.** Калі ты да гэтага не ў курсе, то гэта Пухаў тады табе клей у партфель наліў.

**Я.** Я ў курсе.

*Палкін глянуў на мяне так, быццам я толькі што вылупіўся на свет.*

**Я.** Як тамака гаворыцца? «Мы ўсе былі дзецьмі».

**Палкін.** І смаркачамі табе крэсла выпэцкваў.

**Я**. А я яму скрыню паштовую спаліў. І што зараз?

**Палкін.** Усё роўна ён мудак.

*Галава зморшчыла нос.*

**Я.** Адкуль ты, наогул гэта прывалок?

*Палкін здзекліва ўсміхнуўся.*

**Палкін.** У метро пад лаваю.

**Я.** Проста так валялася?

**Палкін.** Проста так валялася. Я адразу падумаў, што гэта нехта шапку згубіў.

**Я.** І нахалеры ты гэта падабраў? А раптам яно заразнае?

**Палкін.** Таму што гэта галава, Косця! Жывая галава без ўсялякага цела! Ты наогул калі-небудзь такое бачыў?

**Я.** Малым кіно нейкае... нешта тамака... пра прафесара.

**Палкін**. Не ў кіно! Не праз экранчык!

**Я**. Не.

**Палкін**. І я – не. Таму і падумаў, што ўсё, гамон – няма больш нармальнага Сашы Палкіна!

**Я.** А падабраў нашто? Валялася бы сабе.

**Палкін.** Ты праўда не даганяеш?

**Я.** Нехта забыўся, мабыць.

**Палкін.** Галаву? Жывую? Без тулава? Якая моргае, разяўляе рот і усміхаецца?

*Я паціснуў плячыма.*

**Палкін.** Зараз, дзякуючы табе, я разумею, што гэта не галюцынацыя. Зараз я не сумняваюся, што галава рэальная, а не мой глюк. А то былі,

былі намеры... Вось, думаю, табе і глюкі, толькі паспрабуй зразумець з чаго – я жа як шкло, я нават піва не піў!

**Я.** А раптам прыйдзе Пухаў і скажа, што мы абодва з табой шызікі, а гэта проста нейчыя шапка з гузікамі замест вачэй?

*Палкін паглядзеў на мяне сціснуўшы вусны.*

**Палкін.** Я табе зараз наваляю за Пухава.

**Я.** Я жартую.

*Мы паглядзелі на галаву. Галава ўважліва глядзела на нас.*

**Я.** І як ты яе з метро вынес?

**Палкін.** Проста пад курткай. Не за валасы ж было валачы. Дома вось сумку знайшоў – і да цябе.

**Я.** Каб пераканацца, што ты...?

**Палкін.** Не з'ехаў кукухай.

*Я наліў сабе ў кубак з-пад крана вады і зрабіў некалькі глыткоў, не адводзячы вачэй ад галавы.*

**Я.** Добра. Дапусцім. Не разумею толькі, як яна да гэтага часу жывая. У яе тамака, дзе шыя... ну...

*Я паказаў на сабе.*

**Палкін.** Тамака гладка. Скура. Ніякіх разрэзаў.

**Я.** Цікава. Цікава.

*Я пакружыў каля галавы. Галава сачыла за мной вачыма, наколькі магла.*

**Палкін.** Мякка кажучы.

*Я завяршыў сваё кружэнне наўкол галавы, стаў насупраць яе твару, усё яшчэ трымаючы ў руках кубак, нахіліўся і зазірнуў у звычайныя карыя вочы.*

**Я.** Эй! Цябе клічуць-та як?

*Галава не адказала, толькі ўсміхнулася.*

**Палкін.** Як яна табе адкажа, боўдзіла ты? У яе ж лёгкіх няма!

*Я павярнуўся да Палкіна.*

**Я**. А гэта неяк уплывае?

*Палкін пакруціў пальцам ля скроні.*

**Палкін.** Пра паветра, якое праз галасавыя звязкі праходзіць, чуў калі-небудзь?

**Я.** Ну. Так. Нешта.

**Палкін.** Вось не тупі.

*Я нахіліўся да галавы яшчэ ніжэй.*

**Я.** Гэта дакладна мужык.

**Палкін.** Ты – геній.

**Я.** Твой сарказм не да месца.

*Я выпрастаўся і паглядзеў на Палкіна.*

**Я.** Што яно...

**Палкін.** Ён.

**Я.** Добра, ён. Што ён наогул умее?

*Палкін паціснуў плячыма.*

**Палкін.** А я ведаю? Я што, нейкія эксперыменты праводзіў?

**Я.** Ну, напрыклад, мы ведаем, што гаварыць ротам яно дакладна не ўмее.

*Галава падмаргнула правым вокам. Палкін пачухаў падбародак.*

**Палкін.** Чакай.

*Палкін павярнуўся да галавы.*

**Палкін.** Ты размаўляць умееш?

*Галава скрывілася незадаволена.*

**Я.** Яно тупа паскураецца.

*Палкін махнуў на мяне рукою.*

**Палкін.** Не, чакай.

*Я пацiснуў плячыма і сеў у крэсла.*

**Я.** Калі гэта наогул не цацка, вядома.

**Палкін.** Ды змоўкні ты дзеля бога! Скептык сраны! Галава – жывая!

*Палкін павярнуўся да галавы.*

**Палкін.** Ты жывая?

*Галава падміргнула левым вокам.*

**Палкін.** Ці ты цацка?

*Галава падміргнула правым вокам. Палкін, закалаціўшыся, павярнуўся да мяне.*

**Палкін.** Ты разумееш, дурань? Яна адказвае! Галава адказвае!

*Ён павярнуўся да галавы.*

**Палкін.** Левае вока – гэта «так»?

*Галава падміргнула левым вокам.*

**Палкін.** А правае – «не»?

*Галава падміргнула левым вокам. Палкін павярнуўся да мяне матаючы кулакамі .*

**Палкін.** Цацка, кажаш? Цацка?

*Я паціснуў плячыма, не ведаючы, што сказаць.*

**Палкін.** Гэта галава, балван! Жывая, сапраўдная галава!

**Я.** Так. Толькі без тулава. А так не бывае.

**Палкін.** Ды мне як бы пляваць, як бывае!

**Я.** Ты толькі што ў дурку баяўся загрымець. Я толькі што чаранком ад клюшкі павінен быў цябе лупіць, калі нешта пойдзе не так. Хаця да гэтага часу не зразумеў, што менавіта... і нашто біць.

*Палкін паглядзеў на мяне і цяжка ўздыхнуў.*

**Палкін.** Ты абыякавы, Косця. Ты сраны сухар без разынак, такі, ведаеш, самы апошні на нізе пакета – маленькі і... Ай.

*Палкін махнуў рукой.*

**Палкін.** Я прынёс табе дзіва, каб падзяліцца ім з табою. Не з Пухавым і не з кім-небудзь яшчэ, хто акрамя «Фарсажу» і піва не ў чым не кемліць. А ты...

**Я.** А я проста пакуль не магу паверыць. Я занадта рацыянальны.

**Палкін.** Вось нахалеры табе Пухаў!.

**Я**. Ды адчапіся ты ад Пухава.

**Палкін.** Пухаў нават не тупы, ён элементарны да аднаклетачнасці!

**Я.** Ну, значыцца, і я такі.

**Палкін**. Ну не жа, Косця! Ну не! Ну гэта жа ты навучыў мяне фантастыку чытаць і відэа на ютубе пра ўсялякі космас глядзець! Ты той, хто захапляецца, а я за табой следам захапляюся!

**Я.** Я звычайны.

**Палкін.** Звычайны ён, ага...

*Палкін пакружыў па пакоі, спыніўся, паглядзеў трохі ў падлогу, пасля падышоў да галавы.*

**Палкін.** Вось скажы, галава. Пухаў яму для нечага неабходны?

*Галава збянтэжана падціснула вусны.*

**Палкін.** Дзеля таго, каб самаму сабе не здавацца занадта складаным, так?

*Галава падміргнула левым вокам. Палкін пераможна ўсміхаючыся, утаропіўся на мяне.*

**Палкін.** Гэты Пухаў, зямля яму пухам...

**Я.** Не кажы так, гэта абразліва.

**Палкін.** Гэты Пухаў! Зямля яму пухам! Проста самы звычайны твой зазямліцель! Што, я не маю рацыю?

*Палкін павярнуўся да галавы.*

**Палкін.** Галава, я маю рацыю?

*Галава падміргнула левым вокам. Я схапіў чаранок клюшкі і амаль ўмазаў па гэтай галаве, але Палкін своечасова зграб мяне ў ахапак і адкінуў на канапу.*

**Палкін.** Ты што, ашалеў?

**Я.** Саша! Досыць мяне дурыць ! Прыбяры сваю чортаву машынку! Ужо не смешна!

*Я саскочыў з канапы і кінуўся да Палкіна.*

**Я.** Дзе пульт? Дзе пульт, сабака ты? Аддай пульт.

*Я разадраў на Палкіну куртку і падбіў яму вока.*

**Я.** Я зараз выкіну праз акно гэту гадасць, калі ты не ўціхамірышся!

*Палкін трымаў мяне вельмі моцна і глядзеў зверху ўніз з нейкай вельмі дарослай сумотай. Я працягваў матляцца. Палкін працягваў мяне трымаць. Праз пару хвілін я знямогся і павіс у руках Палкіна як нікчэмная ануча. Трошкі паскуголіў.*

*Палкін пасадзіў мяне ў крэсла і стаў паміж мной і галавой.*

**Палкін.** Няўжо ты не зразумеў…

*Палкін казаў вельмі ласкава і ціха.*

**Палкін.** Няўжо ты не зразумеў, што гэта па-сапраўднаму?

*Я паціснуў плячыма.*

**Я.** Мне ўсё роўна.

**Палкін.** Адзін я не давяраў. Але з табой усё стала на сваё месца. Ты таксама яе бачыш. Я – не вар’ят. Дзіва – ёсць!

**Я.** А ты ўпэўнены, што я не частка твайго псіхозу.. А, Саш?

*Палкін знерухомеў.*

**Я.** Ці насамрэч ты ў мяне дома? Раптам ты на сметніку, размаўляеш сам насам, спрабуеш мяне ўпэўніць, што вось гэта смярдзючая галоўка капусты – гэта жывая...

*Я запнуўся.*

**Я.** Гэта жывая, чароўная галава?

*Палкін доўга маўчаў,уважліва мяне разглядаючы.*

**Палкін.** Гэта не галоўка капусты.

**Я.** Тады гэта альбо цацка, альбо гэта наогул немагчыма.

**Палкін.** А ці добра мы, Косця, ведаем, што магчыма, а што не?

**Я.** Вось толькі не трэба! Вось толькі не трэба ўсяго гэтага!

**Палкін.** Чаго гэтага?

**Я.** Фігні з… як тамака гэта газета называлася?

**Палкін.** Не ведаю пра што ты.

**Я.** Усё ты ведае. Што Бога няма, таго свету няма, дзівосаў няма. Кропка.

**Палкін.** І ўсё гэта да чаго?

**Я.** Да тога, што фантастыка – гэта забава, гімнастыка для мазгоў. Вось і усё.

**Палкін.** У мяне ідэя.

Я. Ну?

**Палкін.** Давай запытаемся.

**Я.** У каго?

**Палкін.** У яе. У галавы.

**Я.** А ты ўпэўнены, што яна дае выключна правільныя адказы?

**Палкін.** А мы па прыколу.

*Я ўздыхнуў.*

**Я.** Валяй. Гуляй са сваім пультам.

**Палкін.** Які жа ты ўсё ж такі крэцін, Косця. Ну хочаш, я дагала распрануся? Каб ты ўрэшце паверыў.

**Я.** А давай! А калі слабо, тады звані Пухаву.

*Палкін паглядзеў на мяне, быццам хацеў спапяліць, пасля зняў куртку, кашулю, майку, нагавіцы і застаўся стаяць у майтках і шкарпэтках. Я абмацаў усе кішэні ў скінутай адзежы, знайшоў толькі паўпустую пачку цыгарэт, запальнічак, праязны на метро і цалкам пусты кашалёк. Ніякага пульта насамрэч не было.*

**Палкін.** Майткі здымаць? А то можа я ў кусціках твой забабонны пульт хаваю?

*Я махнуў рукой, і Палкін апрануўся, пакінуўшы толькі драную куртку ляжаць на канапе..*

*Мы павярнуліся да галавы. Галава глядзела на нас уважліва, трохі збянтэжана ўсміхаючыся.*

**Палкін.** Ну што, хто першы?

**Я.** Я нават не ведаю, пра што пытацца. Давай ты.

**Палкін.** Добра. Пачнём з істотнага.

*Палкін узбуджана пацёр далоні.*

**Палкін.** Скажы-ка нам, галава. Бог ёсць?

*Галава падміргнула правым вокам. Палкін павярнуўся да мяне.*

**Палкін.** Правае – гэта што?

**Я.** Правае– гэта “не”, наколькі я запомніў.

**Палкін.** А мне здаецца, што гэта “так”.

**Я.** Я наогул не разумею, чаму мы вырашылі, якое вока што азначае.

**Палкін.** Галава! Калі правае вока – гэта “не”, то заплюшчвай абодва вока разам.

*Галава паслухалася і зажмурылася.*

**Палкін.** Дакладна?

*Галава зажмурылася яшчэ раз.*

**Палкін.** Халера.

*Галава ўсміхнулася быццам трохі спачуваючы.*

**Палкін.** Так што атрымоўваецца. Бога няма?

*Галава заплюшчыла левая вока.*

**Палкін.** Ну ладна, няхай так. А той свет як? Пасля смерці што?

*Галава глядзела на Палкіна і ўсміхалася.*

**Я.** Ты дакладнае пытанне задай, дурань. На "так" альбо "не".

**Палкін.** Ёсць што-небудзь пасля смерці?

*Галава насупілася.*

**Я.** Яна не ведае.

**Палкін.** Ну пра бога яна нам адказала.

**Я.** Адкуль ты ведаеш, што яна нас не дурыць? З чаго ты увогуле узяў, што гэта нейкі аракул. Ты знайшоў гэту штуку ў метро пад лавай.

**Палкін.** І што з таго?

**Я.** Гэта смецце.

**Палкін.** Сам ты…

*І Палкін павярнуўся да галавы.*

**Палкін.** Ты пасланец з іншай планеты?

*Галава заплюшчыла правае вока.*

**Палкін.** Гэта значыць, што ты адсюль?

*Галава зноў заплюшчыла правае вока.*

**Я.** Мне здаецца яна рандомна заплюшчвае вочы і так забаўляецца.

*Галава ўсміхнулася.*

**Я.** Ну вось, бачыш! Здзекуецца!

*Галава ўсміхаючыся, заплюшчыла правае вока.*

**Палкін.** Ага! Ага!

**Я.** Ды што “ага”? Хочаш, я табе таксама памаргаю?

**Палкін.** Які ты ўсё ж такі тухлы, Косця.

**Я.** Мяне проста стаміла гэта “дзіва”. Тым больш да гэтага часу яно не сказала нічога карыснага.

**Палкін.** Як жа? А Бог? Яго няма.

**Я.** Гэта я і сам ведаю і ведаў. Няма Бога і наогул нічога няма, акрамя гэтага жыцця.

*Галава незадаволена паморшчылася.*

**Я.** Альбо нешта ёсць?

*Галава заплюшчыла левае вока.*

**Палкін.** Пасля смерці?

*Галава скрывіла непрыемную грымасу.*

**Палкін.** Добра. Фіг з ім. Ты вось што скажы? Ты чыя?

*Галава заплюшчыла правае вока.*

**Палкін**. Гэта значыць, свая ўласная?

*Галава заплюшчыла левае вока. Палкін павярнуўся да мяне.*

**Палкін.** Вось бачыш, яна цалкам самастойная істота.

**Я.** Толькі перасоўвацца самастойна не можа.

*Галава заплюшчыла левае вока.*

**Я.** Дармаед, карацей.

*Галава задаволена ўсміхнулася.*

*Палкін паглядзеў на мяне як на чарвяка, пакружыў трохі па пакоі. Нарэшце звярнуўся да галавы.*

**Палкін.** Добра, фіг з ім з Богам. Ты мне пра Д'ябла раскажы. Д'ябал -та ёсць?

*Галава заплюшчыла левае вока. Палкін расплюшчыў рот.*

**Палкін.** Гэта як? Ты не пераблытала?

*Галава заплюшчыла левае вока.*

**Палкін.** Яшчэ раз. Д'ябал ёсць?

*Галава заплюшчыла левае вока.*

**Палкін.** Бога няма, Д'ябал ёсць?

*Галава заплюшчыла левае вока.*

**Палкін.** Я нічога не разумею.

**Я.** А я разумею. Ты, як апошні ідыёт, калупаешся ў заскарузлых катэгорыях, а свет, Саша, свет – куды складаней! Які Бог, які Д'ябал? Што за дзіцячы садок? Выбірайся з пясочніцы і кідай ужо свае кулічы!

*Галава заўсміхалася.*

**Я.** Я зараз вазьму клюшку і разнясу гэту хрэнь на кавалкі, як пераспелы кавун, разумееш?

*Палкін стаў паміж мной і галавой.*

**Палкін.** Яна – мая! Знойдзеш сабе сваю галаву – рабі з ёй што хочаш.

Я. А я сваю ўжо знайшоў, Саша. Вось яна.

*І я пастукаў сябе па ілбе.*

**Я.** Можа не найлепшая, але мая. І я ёй, прабач мяне, кемлю. А табе патрэбна другая, каб вырашаць настолькі дзіцячыя пытанні, што…

*Я махнуў рукой. Палкін ажно задыхнуўся.*

**Палкін.** Цябе паслухаць, так пытанні светаўпарадкавання – дзіцячыя? Тыя пытанні, што цікавілі найвялікшых мысліцеляў і наогул… Ты… Ты…

**Я.** Саша, ну які Бог? Які Д'ябал? Мы з табой дарослыя людзі.

*Палкін памаўчаў. Пасля павярнуўся да галавы.*

**Палкін** Добра. Скажы, галава…а ці ёсць смерць?

*Галава заплюшчыла правае вока. Памарудзіла і заплюшчыла левае.*

**Палкін.** Нічога не разумею.

**Я.** Ты задаў дурное пытанне.

**Палкін.** Чаму?

**Я.** Ну вось калі зараз я табе лязом нажа разану па горлу, што будзе?

**Палкін.** Прычыненне цяжкіх цялесных.

**Я.** І… пасля?

**Палкін.** І пасля, магчыма, смерць.

**Я.** Так ёсць смерць?

**Палкін.** Галава кажа, што і ёсць, і няма.

**Я.** А твая ўласная галава што табе гаворыць?

*Палкін змоўк.*

**Палкін.** Мая ўласная галава ў гэта не верыць.

**Я.** Менавіта ў што?

**Палкін.** У маю смерць…

**Я.** Правяраць мы, вядома, не будзем.

*Палкін з жалем кіўнуў. Мы памаўчалі.*

**Палкін.** Я вось што хачу запытацца. Калі д'ябал ёсць, то што ён такое? Але як запытаць, калі толькі «так» і «не».?

**Я.** Метадам выключэння.

**Палкін.** Напрыклад?

*Я павярнуўся да галавы.*

**Я.** Адкажы-ка мне, галава. Д'ябал – гэта пучок пятрушкі?

*Галава з усмешкай заплюшчыла правае вока.*

**Палкін.** Так мы можам мільён гадоў перабіраць.

**Я.** Не тупі, Саня, Глядзі і вучыся.

*Я ўсміхнуўся галаве, тая ўсміхнулася ў адказ.*

**Я.** Д'ябал – гэта чалавек?

*Галава заплюшчыла правае вока.*

**Я.** Д'ябла – гэта нейкі дух?

*Галава заплюшчыла правае вока.*

**Я.** Д'ябла – гэта...

*Я запнуўся.*

**Я.** Добра. Д'ябла – гэта гэты свет?

*Галава заплюшчыла левае вока.*

**Палкін.** Што? Гэта як?

**Я.** Неяк вось так.

**Палкін.** Я нічога не зразумеў. Чаму ты наогул так запытаў?

**Я.** Ведаеш, гарэзлівасць.

*Палкін змоўк, закрыўшы твар рукамі.*

**Я**. Ты да гэтага часу ўпэўнены, што гэта штука адказвае не так, як ёй уздумаецца?

*Палкін страпянуўся.*

**Палкін.** Галава! Я скора памру?

*Галава паглядзела на Палкіна сумна і трохі па-злоснаму. І неахвотна заплюшчыла левае вока.*

**Я.** Гэта табе зязюля што лі? Зусім звар'яцеў?

*Палкін асунуў плечы і надоўга змоўк.*

**Палкін.** Мне здаецца, ад гэтай рэчы сыходзіць нейкая цёмная аўра.

**Я.** Вось як ты загаварыў.

**Палкін.** Мы абавязаны яе знішчыць.

**Я.** Ах вось яно што.

*Галава ціхамірна ўсміхалася. Палкін панура маўчаў, не гледзячы ў яе бок.*

**Я.** Ідыёт. Я таксама памру. І таксама неўзабаве.

**Палкін.** Ты не разумееш.

**Я.** Жыццё наогул кароткае, як...сэкс, напрыклад.

**Палкін.** Які такі сэкс? Што ты гародзіш?

**Я.** Ладна. Ёлупень. Глядзі.

*Я павярнуўся да галавы.*

**Я.** Скажы мне, галава. Палкін памрэ заўтра?

*Галава заплюшчыла правае вока.*

**Я.** Праз год?

*Галава заплюшчыла правае вока.*

**Я.** Праз дзесяць гадоў?

*Галава заплюшчыла правае вока.*

**Я.** Ну добра, праз сорак?

*Галава заплюшчыла правае вока. Я павярнуўся да Палкіна.*

**Я.** Ну, ты бачыш, ідыёт. Нават не праз сорак. Старым дзедам драўлянае паліто прымераеш.

*Палкін паглядзеў на мяне. Пасля на галаву.*

**Палкін.** Галава. Я памру... сёння?

*Галава заплюшчыла левае вока. Палкін падскочыў з месца.*

**Палкін.** Нельга нічога пытацца, нельга! Трэба спыніць гэта неадкладна! І выкінуць... гэта.

**Я.** Ну давай я паспрабую, каб ты зразумеў, што гэта проста рандомная фігня.

**Палкін.** Маўчы!

*Ён кінуўся на мяне, спрабуючы заціснуць мне рот, але я паспеў.*

**Я.** Галава, я памру сёння?

*Адказу я не ўбачыў, таму што Палкін паваліў мяне на падлогу і пачаў калаціць кулакамі па твары. Я амаль не бараніўся. Нарэшце Палкін замарыўся і споўз з мяне. Я выплюнуў на падлогу горкую кроў.*

**Я.** Здаецца, зуб хістаецца.

*Палкін падняўся і сеў на канапу, закрыўшы твар крывавымі рукамі. Ён доўга маўчаў. А я ляжаў на падлозе, абмацваючы твар, які імгненна распухаў. Нарэшце Палкін загаварыў.*

**Палкін.** Дарма я яго сюды прывалок. І наогул дарма падабраў. Людзям нельга чапаць такое.

**Я.** Гэта якое?

**Палкін.** Ня людскае. Не для нас зробленае.

**Я.** Ты проста спужаўся абяцанай табе сёння смерці. Якая не факт, што адбудзецца. Чуў калі-небудзь пра самавыконываючыеся прароцтва?

**Палкін.** Не.

**Я.** Гэтая башка можа быць наогул абы чым. З чаго ты ўзяў, што яна гаворыць праўду? Ты не можаш уцяміць, што гэта можа ў прынцыпе злая галава, якая над намі паскураецца дзеля асабістай забавы? Можа, яна такім чынам сілкуецца?

*Палкін паціснуў плечукамі.*

**Палкін.** Я не ведаю. Выкінуць яе?

**Я.** Давай вынесем на сметніцу.

**Палкін**. Э-э-э... неяк... яна жа жывая.

**Я.** А ты ўпэўнены? У сярэдзіну глядзеў?

*Палкін паматляў адмоўна галавой. Потым устаў, узяў са стала брудны нож, падышоў да галавы, што ляжала на ручніку і пырнуў нажом у шчаку пад правым вокам. З раны не адразу, але ўсё ж пацякла кроў. Галава зморшчыла твар.*

**Палкін.** Блін. Я не хацеў.

**Я.** Балюча, мабыць.

**Палкін.** І шо рабіць зараз?

**Я.** Зараз аптэчку прынясу.

*Я схадзіў за аптэчкай, прачысціў ранку і заклеіў пластырам.*

**Палкін.** Жывая.

**Я.** Ну і шо.

**Палкін.** Як жа зараз на сметніцу. Яна... э таго... чалавек.

**Я.** Якім месцам яна чалавек? Гэта проста галава. Якая нават не гаворыць. Яна ў прынцыпе ня можа быць.

**Палкін.** Слухай. Я каля вярнуць у метро пад тую ж лаву?

**Я.** Разумна. Толькі ты гэта зробіш сам.

**Палкін.** Чаму?

**Я.** Ты мяне бачыў? Твая творчасць на маім твары?

**Палкін.** А, гэта... Ты прабач, Косця.

**Я**. Прабачу, калі лячэнне мне аплаціш. Я быццам на бальнічны не збіраўся бліжэйшым часам.

**Палкін.** Проста галава гэта... Я ж кажу табе, ў яе цёмная аўра. Я адразу не разглядзеў. Мабыць, гэта яна мяне сама прыцягнула.

**Я.** Ведаеш, гадоў дваццаць таму недалёка ад маёй работы прадавалі такія кніжкі ў мяккіх вокладках – пра чакры там, пра энергетычны вамперызм, ну і ў гэткім родзе. Для такіх прыдуркаў як ты.

**Палкін.** Ну добра, не аўра. Я не ведаю якое слова падабраць. Карацей. Гэта злая штуковіна. І яна на нас уплывае.

**Я.** На нас уплываеш ты і твая... цацка. Пакладзі на месца, і забудземся.

*У дзверы пазванілі.*

**Палкін.** Хочаш, я адкрыю?

**Я.** Давай. З такой рожай я ...сам ведаеш.

*Палкін выйшаў у вітальню і праз пару хвілін вярнуўся з Пухавым. Я хутка накрыў галаву, што ляжала на стале, ручніком.*

*Пухаў быў п'яны, але выглядаў вінаватым.*

**Пухаў.** Касцян, я недзе ключы пасеяў. Не магу дамоў папасці. Марынка так не пускае. Званіў, званіў... А што ў цябе, дарэчы з тварам?

*Я паціснуў плячыма.*

**Я.** Лепей бы ў мяне наогул не было б аніякага твару. З галавой у дадатак.

*І я выразна паглядзеў на Палкіна. Той збянтэжана адвярнуўся.*

**Пухаў.** А чё тут у вас? У ручніку?

*Пухаў без ўсялякага працягнуў руку і разгарнуў ручнік. Мы з Палкінам кінуліся было спыніць яго, але не паспелі.*

**Пухаў.** О. Галава. Адкуль?

*Мы з Палкіным маўчалі.*

**Пухаў.** Каго завалілі? І нашто галаву трэба было адсякаць?

*Галава расплюшчыла вочы і паглядзела на Пухава. Пасля ласкава ўсміхнулася. Пухаў скалатнуўся, але адразу зарагатаў, гледзячы то на мяне, то на Палкіна.*

**Пухаў.** Гэта хохма такая, так? У стале дзірка, а там унізе чел сядзіць.

*Мы з Палкіным кіўнулі.*

**Пухаў.** Файна прыдумалі. Смешна.

*Пухаў патузаў галаву за нос. Потым паглядзеў на мяне.*

**Пухаў.** Так што з тварам-та?

**Палкін.** Мы падраліся. Усяго-та.

**Пухаў.** З-за гарэлкі?

**Я.** Вядома.

*Пухаў выцягнуў з кішэні пляшку.*

**Пухаў.** А ў мяне вось.

*І ён ўсміхнуўся. Пасля па-гаспадарчы сеў за стол, узяў сабе больш-меньш чыстую чарку, скруціў пляшцы шыю, наліў чарку і адразу перакуліў у сябе. Паглядзеў на галаву, якая ляжала перад ім на ручніку.*

**Пухаў.** Цябе – та як завуць?

**Я.** Жэня.

**Палкін.** Міша.

**Пухаў.** Так Жэня ці Міша?

**Я.** У яго падвойнае імя – Яўгеній-Міхаіл.

*Пухаў паглядзеў на мяне вылупіўшы вочы.*

**Пухаў.** Гэтак можна?

*Я кіўнуў. Палкін кіўнуў следам за мной.*

*Галава ўсміхнулася.*

**Пухаў.** Ну што, Жэня – Міша. Піць-та будзеш?

*Галава ўсміхнулася. Пухаў павярнуўся да нас.*

**Пухаў.** Будзе?

*Мы кіўнулі.*

**Пухаў.** Няхай вылазіць з-пад стала, шо так сядзець, нязручна, мабыць.

*І Пухаў зазірнуў пад стол. Выпрастаўся і паглядзеў на нас. Пасля зноўку зазірнуў пад стол. І зноў – на нас.*

**Пухаў.** Так а дзе...ён?

*Мы паціснулі плячыма. Пухаў залез пад стол цалкам і доўга там поўзаў, мацаючы рукамі. Нарэшце выпаўз, чырвоны і потны.*

**Пухаў.** Гэта што за фокус?

**Я.** Складаны. Пух, можа ты дадому ўжо пойдзеш?

**Пухаў.** Я зразумець хачу.

**Палкін.** Не зразумееш.

**Пухаў.** А я хачу.

*І выпіў яшчэ чарку.*

**Пухаў.** Давай, Жэня-Міша, фокуснік ты гэткі, за цябе.

*Пухаў наліў сабе і проста з бутэлькі паспрабаваў напаіць галаву, якая з цяжкасцю адкрыла рот. Гарэлка з рота галавы выцекла на ручнік.*

**Пухаў**. Што ж ты так, Жэня ты, Міша...

*Тут Палкін падышоў да галавы, узяў яе на рукі і падняў над сталом, трымаючы асцярожна, быццам рэліквію. Пухаў закрычаў.*

**Я.** Недалёкі ты чалавек, Пух. І напужаць цябе лёгка.

**Пухаў.** Што гэта?!

**Палкін.** Галава.

**Пухаў.** Але як? Яна што, жывая?

**Я.** Як бачыш?

*Пухаў на нейкі час змоўк раскрыўшы рот. Мы з Палкіным пераглянуліся.*

**Я.** Дзіця.

**Палкін.** Малеча.

**Я.** Галава, між іншым, Пух, на пытанні адказвае і лёс прадказвае.

**Палкін.** Вось што б ты хацеў запытацца?

**Пухаў.** Дзе ключы мае...

**Я.** Ну што ж, галава. Ключы Пуха ў гэтай кватэры?

*Галава заплюшчыла правае вока.*

**Палкін.** Галава гаворыць, што не.

**Я.** Галава! Ключы Пуха ў гэтым доме?

*Галава заплюшчыла правае вока.*

**Палкін.** Значыць, Пух, недзе на двары ты іх пасеяў.

*Галава здзекліва ўсміхнулася.*

**Я.** Галава! Скажы, а ці існуе наогул сам па сабе Пух? Ці таксама згубіўся?

*Палава памарудзіла і заплюшчыла правае вока. Палкін, разявіўшы рот, паклаў галаву на ранейшае месца.*

**Палкін.** Ну а я? Я-та хоць ёсць?

*Галава заплюшчыла правае вока, ужо не ўсміхаючыся..*

**Палкін.** Значыцца і Касцян адсутнічае...

*Галава паглядзела на мяне і падміргнула левым вокам.*

**Пухаў.** І як гэта разумець?

**Я.** Як хочаш, так і разумей. Але ключоў тваіх у мяне няма. Так што давай, валі дахаты.

*Пухаў падняўся, схапіў са стала сваю бутэльку, закруціў корак і запіхнуў бутэльку ў кішэню курткі.*

**Пухаў.** Ведаеш, што...

*Пухаў распіхаў нас і, не азіраючыся, выскачыў з кватэры. Мы памаўчалі, седзячы насупраць адзін аднаго.*

**Я.** Ты разумееш, Саня, што нас з табой няма?

**Палкін.** Здагадваюся.

**Я.** А ты сёння яшчэ і памрэш.

**Палкін.** Ну, калі мяне няма, то я даўно ўжо памёр.

**Я.** Лагічна.

*Мы змоўклі ўжо надоўга.*

**Палкін.** Ну што рабіць будзем?

**Я.** З галавой?

**Палкін.** Наогул з усім. І з галавой у прыватнасці.

*Я паціснуў плячыма.*

**Я.** Давай у яе запытаем.

**Палкін.** Давай.

*Я падняўся і паглядзеў у твар галаве, якая ляжала на стале.*

**Палкін.** Ну што, аднесці цябе на месца?

*Галава заплюшчыла правае вока.*

**Я.** Выкінуць?

*Галава заплюшчыла правае вока.*

**Палкін.** Ну проста так пакідаць тут цябе дакладна нельга.

*Галава заплюшчыла абодва вока і прыкінулася быццам спіць.*

*У пакой з куском жалезнай трубы ўварваўся Пухаў і з размаху джвагнуў па галаве, якая ляжала на стале на ручніку. Галава прамялася ўнутр, быццам мяч, які цудам трымаў форму нават калі яго здулі. Пухаў замахнуўся яшчэ раз, але Палкін кінуўся на яго, выставіўшы перад сабой рукі. Па гэтым рукам ён і атрымаў трубой. Я схапіў нож, які адляцеў на падлогу і выставіў перад сабой, цэлячыся, на усялякі выпадак у Пухава. Але той, адпіхнуўшы ад сябе Палкіна, які скуголіў, распачаў не спыняючыся калашмаціць па галаве, якая стала падобна на разбіты кавун. Я на імгненне нават падумаў, што гэта і праўда кавун, але ў кавуна няма вачэй, якія вылятталі з арбіт, няма пырскаючых ва ўсе бакі зубоў. Пухаў лупіў галаву і роў.*

**Пухаў.** Нельга так! Нельга так! Такое не можа...

*Урэшце ад галавы засталося толькі шмаццё костак, ружовыя камякі і заляпаны крывёю стол і ручнік. Пухаў спыніўся, увесь перапэцканы, з лупатымі вачыма, быццам недзе знаходзячыся, але дакладна не тут.*

**Палкін**. Ты мне руку паламаў, ты...цвіль!

**Пухаў.** Ну вось, зараз усё правільна. Ніякіх фокусаў.

*Ён кінуў трубу на падлогу і выйшаў з кватэры. Палкін праводзіў Пухава позіркам, люляючы зламаную руку. Пасля паглядзеў на мяне.*

**Палкін.** Вось і няма нічога, Косця. Зусім нічога. Адзін толькі боль.

*Я нічога не адказаў.*

*Лістапад 2021г.*

*Пераклад Вольгі Кавалеўскай*

*15ok@mail.ru*